# МІХАЛЕВІЧ Аляксей Анатольевіч



Нарадзіўся 15 мая 1975 г. у Мінску, беларус, беспартыйны.

Скончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Стажыраваўся ў Оксфардскім універсітэце (Англія).

Працаваў намеснікам дырэктара, генеральным дырэктарам сумеснага беларуска-польскага прадпрыемства «Аркадыя».

У 2003—2007 гг. — дэпутат Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў, каардынатар Асамблеі мясцовых саветаў.

Антыкрызісны менеджар, акрэдытаваны Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь (2005 г.).

У 2007—2010 гг. — юрыст Асацыяцыі інвалідаў вайны ў Афганістане і Беларускага незалежнага прафсаюза.

Акрамя родных беларускай і рускай, таксама валодае англійскай і польскай мовамі.

Працуе юрысконсультам у агенцтве перакладаў і юрыдычных паслуг.

Жанаты, бацька дзвюх дачок.